*Друкуецца паводле публікацыі ў:* Захаванне нацыянальнай самабытнасці ў кантэксце развіцця міжкультурнага дыялогу: матэрыялы прэзентацыі–семінара “Як захаваць культурную самабытнасць у кантэксце развіцця міжкультурнага дыялогу?”, Мінск, 2 чэрвеня 2010 г. Мінск: РІВШ, 2010. С. 60—62.

## Тэксты, напісаныя для сайта “Беларускі партызан” у 2011—2012 гг.

### Свая чужая краіна

Заўсёды ганарыўся Беларуссю. Калі вучыўся ў Маскве, то ўся тысячная грамада жыхароў інтэрната ведала: у гэтым пакоі жыве Саша–беларус. У адрозненне ад Юры Шпакоўскага з Менска ці Тумялевіча з Віцебска… Калі менскае “Дынама” стала чэмпіёнам Саюзу, то грузіны, таджыкі, армяне, абхазцы некалькі дзён хадзілі віншаваць менавіта мяне. Так я стаў нацыяналістам.

Зараз не магу пазбавіцца прыкрага адчування, што мая краіна перастала быць маёй. Непрыемна жыць пад прэсам дыскрымінацыі толькі таму, што ты ў Беларусі гаворыш па–беларуску. Не магу адправіць дзіця ў беларускую гімназію, бо яе няма. Не магу купіць каляндарыка з назвамі месяцаў па–беларуску — па той жа прычыне. Не магу паслухаць добрую беларускую песню па радыё, бо яе забаранілі.

Гляджу часам тэлевізар і трасу галавой, каб абудзіцца — ці гэта сон, ці ява? На экране афіцыйны прэзідэнт загадвае дапытаць апазіцыю па справе выбуху ў менскім метро, каб знайсці замоўцаў. У якой нармальнай краіне такое магчыма?

Міністр унутраных спраў распавядае, як шукалі і знайшлі выканаўцаў. Дзядзька з манерамі і выглядам калгаснага брыгадзіра (спецыяльная селекцыя), толькі апрануты ў мешкаватую генеральскую форму, гаворыць гэтаксама і тымі самымі словамі, як пра Плошчу — 19 (як прафесійна спрацавалі органы, як апазіцыя назапашвала зброю, якую не знайшлі). І я яму не веру! Не магу верыць, пры ўсёй нянавісці і агідзе да злачынцаў, падклаўшых выбуховую прыладу. Я баюся, што могуць пацярпець невінаватыя людзі, таму што не маю ні кроплі веры ў справядлівасць лукашэнкаўскай праўнай сістэмы і яе вернасць закону. Ужо загадана раздаць ордэны баявым аператыўнікам, куды там чакаць канца следства, не кажучы ўжо пра рашэнне суда! Цынічна

выціскаецца ўсё магчымае для сваіх канкрэтных палітычных інтарэсаў. Часам гэта прарываецца вярбальна. Як сказаў адзін лукашыст, пасля выбуху склаўся "спрыяльны клімат" для выдання Беларусі крэдыту.

Што сталася з маёй краінай?

14. 04. 2011 г.

## Турма — як бяда

На вуліцы Вялікага Ноўгарада да мяне падышоў чалавек і папрасіў грошай. Мужчына сярэдніх гадоў, бедна, але чыста апрануты, гладка паголены твар, ніжняя губа дрыжыць ад прыніжэння. Даў хутчэй і пайшоў далей пад уражаннем аргумента, праз які чалавек меў атрымаць грошы ад мінака: "Я недавно вышел из мест заключения…" На Беларусі гэта апошняя прычына жабраваць грошы. Ну там, "пагарэлі", "абакралі", "збіраю на білет дадому", але не — "Дайце грошай, бо я выйшаў з турмы!"

У расейскай ментальнасці турма ўспрымаецца як бяда, прыроднае няшчасце, такое выхаванне ад стагоддзяў мелі нашыя суседзі ў маскоўскай дзяржаве. Беларусы стагоддзямі выхоўваліся на Статуце, таму вязніцу ўспрымаюць як заслужанае пакаранне за парушэнне закону. "Ні за што ў турму не садзяць!" — тыповая беларуская рэакцыя.

Але ўвага! Літаральна на працягу жыцця аднаго пакалення за кіраванне аднаго толькі прэзідэнта можа быць пераадолена і зліквідавана гэтая цывілізацыйная беларуска–расейская розніца. Уся лукашэнкаўская судовая сістэма стала вялікай нацыянальнай бядой. На працягу 16 гадоў нам ледзь не кожны дзень дае прыкрае дасведчанне: "Закон у Беларусі — нішто!" Людзі ідуць у турму нізавошта, толькі за тое, што нязгодныя, ідуць па сфабрыкаваных абвінавачваннях, прычым сфабрыкаваных тупа і прымітыўна. Чатыры гады строгага рэжыму чалавеку толькі за тое, што быў на Плошчы. А дзе тыя, хто біў вокны і дзверы дома ўраду? Спраўныя гэбісты з пракурорамі, пакажыце хоць аднаго!?

Спіс нявінна засуджаных на Беларусі можа скласці ўжо цэлую энцыклапедыю. Як гісторык кажу, такая энцыклапедыя будзе створана, і ў яе ўвойдуць таксама прозвішчы тых, хто заводзіў людзей у несправядлівую турму. І пачатак такой энцыклапедыі ўжо ёсць — спіс неўязных у Еўропу.

27. 04. 2011 г.